ассоциируется с именем животного, как это бывает в народных сказках, где кота зовут «Котофей Иванович» (от слова «кот»). В других сказках названия животных пишутся, как имена собственные, с большой буквы (Волк, Заяц).

Если в народной сказке представление антропоморфных персонажей как социальных типов находится еще в зачатке, то многие литературные анималистические сказки уже отражают государственный строй целой страны. Так, в сказке итальянского писателя Дж. Родари «Приключения Чиполлино» представлено феодальное общество.

Для народных анималистических сказок свойственна частичная антропоморфность персонажей, степень проявления которой является неоднородной. В результате данные сказки можно разделить на пять групп: «доантропоморфные» сказки («Медведь на липовой ноге»); сказки, в которых наблюдается антропоморфизм на уровне мироустройства (некоторые кумулятивные сказки и сказки этиологического характера); сказки, для которых характерно наличие антропоморфного персонажа; сказки, изображающие антропоморфных персонажей как представителей определенных социальных типов («Кот на воеводстве»); фольклорные сказки, подвергшиеся литературной обработке. Средняя степень антропоморфности наблюдается в большинстве литературных сказках. Полная степень антропоморфности животных не характерна для анималистических сказок, в которых нет места таким внешним метаморфозам персонажей, как, например, в волшебной сказке. Так, в пьесе Е. Шварца «Обыкновенное чудо» и в романе-памфлете А. Франса «Остров пингвинов» антропоморфный внешний облик – результат магического воздействия на персонажей.

**Список литературы:**


1. Аникин, В. Русская сказка: пособие для учителей / В. Аникин. – М. : Просвещение, 1977. – 208 с.; ил.
2. Костюхин, А. Типы и формы животного эпоса / А. Костюхин. – М. : Наука, 1987. – 271 с.
3. Пропп, В. Русская сказка / В. Пропп. – М. : Лабиринт, 2011. – 384 с.



***Вольга Кулікова***


## АКТУАЛЬНАСЦЬ НАРОДНЫХ ГУМАНІСТЫЧНЫХ ТЭНДЕНЦЫЙ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ


***Volha Kulikova***


## TOPICAL FOLK HUMANISTIC TENDENT BELARUSIAN CULTURE


*У артыкуле разглядаюцца гуманістычныя асновы беларускай культуры, яе народны характар, значэнне для развіцця сучаснага грамадства ў рэчышчы гуманізму і агульначалавечых каштоўнасцей.*

*The humanistic foundations of the Belarusian culture, its national character, importance for the progress of modern culture in the spirit of humanism and universal human values.*


Тэма гуманізму заўжды актуальная, адносіцца да адвечных, звязаных непарыўна з самім чалавекам у разнастайнасці яго адносін і адаптацыі да свету. Гэта – дынамічныя адносіны, якія робяць тэму гуманізму не проста важнай, але перманентна злабадзённай, актуальнай у грамадскай свядомасці і культура-творчай практыцы. Згодна гуманізму – чалавек ёсць вышэйшая каштоўнасць, мэта грамадскага развіцця. Гуманізм асуджае гвалт над асобай, прызнае правa чалавека на свабоду, шчасце, развіццё яго фізічнай моцы, здольнасцей і талентаў, прапагандуе ідэі сацыяльнай справядлівасці і роўнасці, інтэрнацыяналізм, самаўдасканаленне і ўзвышэнне чалавека, гарманічныя адносіны паміж усімі прадстаўнікамі грамадства.

Асноўная праблема гуманізму – праблема наяўнасці ці адсутнасці ў жыцці ідэальна-натхняючых асноў, прынцыпаў і норм. А калі культура ў цэлым ёсць спосаб быцця пэўнай супольнасці і чалавека ў свеце (у досыць розных яго частках), то спосабы, формы існавання бываюць досыць рознымі. Яны могуць будавацца на відавочнай бязлітаснасці праяўлення прынцыпа панавання і падпарадкавання, выказваючы сваю непрыхільнасць гуманістычным крытэрыям, а могуць быць пранізаны тэндэнцыяй да гуманізацыі, адухатварэнню ўмоў і форм існавання і адносін паміж людзьмі. Апошняя ўзнікае ў рэчышчы тэндэнцыі і патрэбы гуманізацыі чалавечых адносін, а таксама грамадства ўвогуле як універсальная форма рэгулявання і ўпарадкавання жыцця, аб'яднання супольнасці носьбітаў культуры праз маральнасць, духоўнасць. Такім чынам, праблема гуманізму – складанае спалучэнне супярэчлівых тэндэнцый, складанае і хісткаае адзінства паміж дэструктыўнымі з’явамі ў асобе і пераадоленнем іх, стабілізацыяй рознанакіраваных чалавечых праяўленняў, галоўным чынам праз культуру і асабліва мастацтва, у тым ліку мастацтва вуснай традыцыі (фальклор).

Беларуская культура, літаратура і мастацтва ў цэлым – з момантаў свайго ўзнікнення ў пранятыя гуманізмам часы Рэнесансу і Рэфармацыі XIV–XV стст. і да цяперашняга часу, прайшоўшы праз розныя этапы свайго развіцця, складанасці і цяжкасці – не толькі захавалі высокую духоўнасць і гуманізм, але і памножылі іх. Фіксацыя беларускай культуры ў XIX − пачатаку XX ст. (ў яе класічны перыяд наконадні інсціуалізацыі дзяржавы з беларускім этнонімам), сведчыць апошняе сцвярджэнне як «бясспрэчны навуковы факт». Аналітыкі айчынных культуры і мастацтва мяжы XIX−XX ст. назапасілі багаты фактычны матэрыял, які дазваляе сцвярджаць, што менавіта тыя асаблівасці беларускай культуры і мастацтва, якія знітаваныя з народнай культурай, фальклорам, і абумоўліваюць іх гуманістычны характар.

Адзначым, што даследчыкі аднагалосна сцвярджаюць, што «фальклор – праграмная аснова ўсей гуманістычна зарыентаванай сусветнай мастацкай культуры, крыніца асобных нацыянальных мастацкіх традыцый, увасабленне самасвядомасці народаў» [1, с. 11–12]. А беларускі фальклор – асноўная крыніца беларускай культуры. Ён дэмакратычны, з’яўляецца выразнікам глыбіннага светапогляду народа (ідэі людскасці, дабрыні, чалавекалюбства, блізкасці да зямлі і прыроды). Вытокі фальклору шукаюць пераважна ў першабытным дахрысціянскім грамадстве, «грамадзе» – ў «сівой даўніне», акцэнтуюць увагу на яго архаічных, язычніцкіх, дагістарычных рысах.

Беларускі фальклор XIX ст. – яшчэ сінтэз хрысціянскай духоўнасці і старадаўняй міфалогіі. Абумоўлена гэта тым, што з прыняццем хрысціянства этнічная рэлігійная традыцыя не перапынялася, але працягвала сваё існаванне ў выглядзе г. зв. народнай рэлігіі, вызначальнай рысай якой ёсць суіснаванне «высокай» рэлігіі (хрысціянства), звязанай з пануючымі класамі і клірам, ды рэлігійных уяўленняў «простага люду», для якога «высокая» рэлігія «актуальная адно фактам свайго існавання, і які ў паўсядзённых патрэбах кіруецца не святым пісаннем, а традыцыяй, звычаем, дзядоўскай верай» [2]

Можна адзначыць і другі складнік народнай культуры, калі беларусы, надзяляючы прыроду душой і верачы ў яе магутнасць, не выракаліся хрышчэння. Прычыны гэтай «мірнай канвергенцыі», трываласці і жыццёвасці язычніцкіх традыцый у Беларусі ў тым, што далучэнне народа да новай рэлігіі адбывалася с асаблівасцямі: пераважна мірным шляхам і расцягнулася ў часе, бадай што, на два стагоддзі. І трэба улічваць, што да XIX ст. беларускае сялянства існавала ў патрыярхальных умовах натуральнай гаспадаркі, аддаленнае ад культурнага ўплыву, бадай у поўнай недатыкальнасці захавала сваю мову, звычаі, фальклор і інш. Як вынік – росквіт беларускага сялянскага фальклору, як аднаго з самых багатых, што ўжо ў XIX і асабліва ў XX стст. стала фундаментам адраджэння беларускай




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры. Так, генезіс фальклора не адмяняе міфалогії; больш таго, яна «застаецца яго крыніцай і «будаўнічым матэрыялам», хоць і страчвае значную частку сваіх светапоглядных і нарматыўных функцый, паступова рэдуцыруецца ў спецыфічна эстэтычныя формы культуры» [3, с. 56].

Але развіцце ішло, і «найчасцей тыя сюжэты, вобразы і матывы, якія ў язычніцкай міфалогіі мелі сур'ёзнае значэнне ў якасці аб'ектаў веры, у фальклоры (народнай казцы, легендзе, песні) набылі значэнне метафары, сімвала, а нярэдка яшчэ пераасэнсаванае ў гратэскавым свеце». Гэты карнавальна-гратэскавы аспект беларускага фальклору даследуецца ў манаграфіі У. Конана «Ля вытокаў самапазнання» [4]. Гэтая глыбокая архаічнасць – адметная рыса беларускага фальклору, сутнасна гуманістычнага. Асаблівасць беларускай культуры яе блізкасць да фальклора, народнай культуры – да нематэрыяльнага. Апошняе адзначалі дзеячы новай беларускай літаратуры ў XIX ст., для якіх фальклорная традыцыя была адной з крыніц гуманістычнага настрою. Ул. Сыракомля, Я. Баршчэўскі, У. Каратынскі, Я. Чачот, В. Дунін-Марцінкевіч, Ф. Багушэвіч і інш. – усе яны асноваю ў духоўным развіцці чалавека лічылі яго далучэнне да вуснапаэтычнай творчасці народнай паэзіі – песень, казак, прымавак і прыказак, былін, паданняў, іначай кажучы, да невычэрпнай скарбніцы фальклору. Што тычыцца ўплыва хрысціянства, то ўспрыманне каштоўнасцей хрысціянскай этыкі беларускімі асветнікамі XIX–XX стст. было арганічным і аб'ёмным, мае глыбокія культурна-гістарычныя карані. Гэта перш за ўсё – усведамленне этычных з'яў, такіх паняццяў, як дабро, справядлівасць, абавязак, праўда, гонар, годнасць і інш.

Сапраўды: «Сёння нематэрыяльная культурная спадчына – помнікі фальклору – запатрабаваны грамадствам на новым глабалізацыйным – "вітку" яго развіцця… Як элементы яны ўвайшлі ў светапогляд і паводзіны гараджан і невынішчальныя з іх культуры, бо ахоўваюць псіхічнае і фізічнае здароўе чалавека, бароняць яго ад стрэсаў, адзіноты, канфліктаў з сабою і ўласным асяродкам» [1, с. 10]. Гэта – асобасныя культурныя перажыванні беларсаў XXI ст. Адбываецца ўзвышэнне значнасці мастацкай культуры (з абавязковымі фальклорнымі элементамі) як фактара развіцця эмацыянальна-вобразнага боку чалавечага мыслення, фарміравання маральных якасцей асобы-носьбіта этнакультуры беларусаў. Вось чаму асабліва актуальным з'яўляецца цэласнае і ўсебаковае вывучэнне праблем функцыянавання, зместу гуманізму каранёвай мастацкай культуры Беларусі і шляхоў яе ўздзеяння на асобу. На сёняшні дзень працягваецца зварот да гуманістычных традыцый мінулага Беларусі. Ён дае магчымасць раскрыць іх значэнне для развіцця сучаснай культуры ў рэчышчы гуманізму і агульначалавечых каштоўнасцей. Раскрыццё гуманістычных тэндэнцый культуры Беларусі будзе садзейнічаць узбагачэнню прафесійнай нацыянальнай культуры. Больш таго, на пераломных момантах гісторыі, традыцыйныя каштоўнасці набываюць асобы сэнс, становяцца як бы маральным апірышчам у руху наперад. Сэнс гэтых этычных рэгулятараў сацыяльнага жыцця, іх спецыфіка выяўляецца ў тым, што захоўваючы ў аснове сваю змястоўную напаўняльнасць, яны маюць тэндэнцыю к самаабнаўленню і ўзбагачэнню, валодаюць унутраннымі стымуламі і матывамі да самаўдасканальвання.

Гісторыя беларускага народа – адвечны і цяжкі шлях да дастойнага жыцця. На гэтым цярністым шляху беларусы цягам многіх стагоддзяў стваралі свае нацыянальна-грамадскія каштоўнасці, фарміравалі ідэалы, абапіраючыся на культурную спадчыну, народны гуманізм беларускай культуры, і, нягледзячы на ўсе перашкоды, сваім розумам, воляй, працай, крывёю, мужнасцю, вытрыманасцю, цярплівасцю вырашалі тыя праблемы, якія яны лічылі і лічаць галоўнымі. Сёння гэта: праблема дзяржаўнага суверэнітэту; нацыянальнага самазахавання, культуры, роднай мовы; эфектыўнай эканомікі; аптымальнага грамадска-дзяржаўнага ладу; цывілізаваных адносін з суседзямі; міра на беларускай зямлі і інш.

**Спіс літаратуры:**

1. Дарашэвіч, Э. Тэорыя фальклору / Э. Дарашэвіч // У тэзаўрусе Беларусі : да 80-годдзя Энгельса Дарашэвіча / уклад. М. Козенка ; навук. рэд. В. Калацэй. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2011. – С. 10–79.
2. Напольских, В. Заметки на полях: Неоязычество на просторах Евразии / В. Напольских // Вестник Евразии / Acta Eurasica. – 2002. – №1 // Udmurt.info [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.udmurt.info/library/napolskikh/neoyaz.htm. – Дата доступа : 02.04.2019.
3. Конан, У. Міфалогія, фальклор і літаратура ў кантэксце нацыянальнай культурнай традыцыі / У. Конан // Адукацыя і выхаванне. – 1994. – № 4. – С. 47–57.
4. Конан, У. Ля вытокаў самапазнання: Станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору / У. Конан. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. – 238 с.

***Паліна Кургановіч***

## СУЧАСНАЯ РЭКАНСТРУКЦЫЯ СВЯТ НАРОДНАГА КАЛЕНДАРА Ў ЛАНДШАФЦЕ МУЗЕЯ-СКАНСЭНА XXI СТАГОДДЗЯ *(на прыкладзе правядзення свят у Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту)*

***Palina Kuranovich***

## MODERN RECONSTRUCTIONS OF FOLK CALENDAR HOLIDAYS IN THE SKANSEN-MUSEUM OF THE XXI CENTURY LANDSCAPE *(on an example of the holidays in the Belarusian State Museum of Folk Architecture and Household)*

*У артыкуле прааналізаваны ўласны вопыт сучаснай рэканструкцыі традыцыйных свят у музеі-скансэне пад Мінскам. Адзначана, што падчас мерапрыемства ўзнікае своеасаблівая камунікацыя паміж сучасным наведвальнікам і чалавекам мінулага праз створаныя ім матэрыяльныя каштоўнасці.*

*The article analyzes own experience of modern reconstruction of traditional holidays in the Museum-Skansen near Minsk. It is noted that during the event, a kind of communication arises between the modern head shoulders and the man of the past through the material values created by him.*

Сучаснае грамадства, захопленае тэхнічнымі сродкамі камунікацыі і побыту, аддзяляе сучаснага чалавека ад традыцыйных духоўных каштоўнасцей. Але чалавек застаецца ў рамках этна-біялагічнай свядомасці і ўспрымае сусвет так, як яму дазваляе этнічная светапоглядная пазіцыя, сістэма каштоўнасных арыентацый. У сувязі з гэтым нельга забываць аб традыцыйнай культуры свайго народу. У эпоху глабалізацыі чалавек успрымае і ідэнтыфікуе сябе як нацыянальны суб'ект камунікацыі. На сённяшні дзень можна пабачыць заўважную цікаўнасць да нацыянальных традыцый, зварот да этнічных каранёў у гарадскім асяродку. Таму лічу, праца музея, яго аднаўленне і паказ народных свят і абрадаў на сённяшні дзень актуальны і папулярны.

Складанасць сучаснай інтэрпрэтацыі розных традыцыйных свят можна пабачыць у сыходзе гарадской цывілізацыі ад традыцыйных каштоўнасцей, а таксама традыцый, якія не імкнуцца да адпавядання сучасных умоў. У такой сітуацыі папулярызацыя і актуалізацыя абрадавых дзеянняў магчыма толькі пры ўмовах сучаснага адаптавання, з адпаведным інтарэсам сучаснага грамадства. У сучасных умовах глабалізацыі актуалізаваліся і сталі перспектыўнымі этнаэкалагічнае выхаванне і адукацыя. Задача культурна-